# ГОД ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ АБ'ЯДНОЎВАЕ










Прадстаўнікі рэктарату, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага ўніверсітэта далучыліся да рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу», якая праходзіла ў 15-ы раз і была прымеркавана да Года гістарычнай памяці, мэтай якога з'яўляецца фарміраванне аб'ектыўных адносін грамадства да гістарычнага і гераічнага мінулага, захаванне і замацаванне адзінства беларускага народа, папулярызацыя гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны.

Мерапрыемствы, што праходзяць на працягу 2022-га, накіраваны на захаванне праўды пра ўсе перыяды жыцця беларускага народа, у тым ліку пра подзвіг беларусаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, увекавечванне памяці ахвяр генацыду. Акрамя таго, Год народнага адзінства – выдатная нагода рабіць добрыя справы разам. Таму машэраўцы і накіраваліся ў Сенненскі раён, на малую радзіму Пятра Міронавіча Машэрава, імя якога з гонарам носіць наш універсітэт, каб высадзіць елкі і бярозы. Пасадачным матэрыялам работнікаў забяспечыў Багушэўскі лягас. Агульная плошча тэрыторыі для высадкі склала 6,4 га.

«Сёння мы дапамагаем папаўняць прыродныя рэсурсы нашай Беларусі. Лясы – «лёгкія» планеты, якія мы павінны берагчы і прымнажаць для будучых пакаленняў. Я лічу, што агульная справа аб'ядноўвае, дапамагае набыць сяброў і захаваць цёплыя адносіны адзін да аднаго», – адзначыла рэктар універсітэта Валянціна Багатырова.

Як вядома, хто добра працуе, той смачна есць. Таму юшка і каша, прыгатаваныя членамі прафсаюзнай арганізацыі ВДУ і прадстаўнікамі лягаса, прыйшліся дарэчы пасля прадуктыўнай працы. А песні пад гітару стварылі цудоўную атмасферу і яшчэ раз даказалі, што машэраўцы – сапраўдная сям'я.

Далей прадстаўнікі рэктарату, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага ўніверсітэта адправіліся ў Багушэўск, дзе ўсклалі кветкі да помніка воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры вызваленні пасёлка.

**Працяг на 2-й стар.**

# ГОД ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ АБ'ЯДНОЎВАЕ

**Працяг. Пачатак на 1-й стар.**

«Я рады, што прыняў удзел у рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу». У нас была агульная мэта – даць будучаму пакаленню чыстае паветра. У самым пачатку нас падзялілі на пары, і машэраўцы актыўна ўключыліся ў працэс пасадкі. Тыя, хто заканчвалі раней свае палосы, прапаноўвалі дапамогу іншым. Энтузіязм, згуртаванасць і бадзёрасць – вось заклад сапраўднага поспеху», – адзначыў Архіп Громаў, студэнт 1 курса ФГіМК.

«Удзел у рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу» – сапраўднае свята. Сумесная праца дазволіла стаць яшчэ больш згуртаванай камандай, адчуць сувязь пакаленняў. Адразу ўспомніліся мае студэнцкія гады, калі мы ўсе разам адпраўляліся на сельскагаспадарчыя работы, працавалі і ведалі, што робім добрую справу на карысць сваёй краіны. І цяпер хочацца, каб машэраўцы таксама далучаліся да працы. Вельмі важна зберагчы Радзіму, каб і нашы ўнукі любаваліся прыгожай беларускай прыродай», – расказала Жанна Пазняк, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце ФФКіС.



«Прадстаўнікі ваеннай кафедры заўсёды прымаюць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія ладзяцца ва ўніверсітэце. Рэспубліканская акцыя «Тыдзень лесу» не стала выключэннем. Тры афіцэры і сем студэнтаў адправіліся на пасадкуляснога масіву ў Сенненскі раён. Лічу, што такія мерапрыемствы аб'ядноўваюць студэнтаў і выкладчыкаў. І хацелася б, каб стала традыцыяй праводзіць падобныя акцыі разам са сваімі сем'ямі. Я б з задавальненнем узяў з сабой дачку.

У завяршэнні паездкі мы ўшанавалі памяць воінаў, загінуўшых пры вызваленні Багушэўска. Упэўнены, што захаванне гістарычнай памяці вельмі важна для маладога пакалення», – адзначыў Андрэй Ларын, намеснік начальніка ваеннай кафедры, падпалкоўнік.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж глядзіце з дапамогай QR-кода.